Віталь ГАРАНОВІЧ

# Бразнічча





Віталь ГАРАНОВІЧ

# Празвічча



Віталь ГАРАНОВІЧ

# Празвічча

Вершы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1997

ББК 84(4Беи)6
Г 20
УДК 882.6-1

Для старэйшага школьнага ўзросту

*Прадмова Уладзіміра Сауліча*

Г $\frac{8820600000 — 001}{М 302(03) — 97}$ БЗ 44—96

© В. Р. Гарановіч, 1997

ISBN 985-02-0390-0 © У. У. Сауліч. Прадмова, 1997

## СПРАВА І СЛОВА ПАЭТА

Гэтай невялічкай кніжкай, бадай, робяцца два адкрыцці: творцы і чалавека Віталя Гарановіча.

Такой магутнай метафарычнасці радка, такой свежасці слова можна толькі пазайздросціць. Мяркуйце самі:

*Пасеяў снежань белую расаду,*
*Марозік звесіў ногі са страхі.*
*Вятры снягі арфуюць у прысадах,*
*Закінуўшы на неба кажухі.*

Або:

*Разадрата зноў гаёў улонне*
*Крыкам сойкі, строкатам сарок.*
*Саракі пад парасонам поўні*
*Развязалі выраю шнурок.*

І даводзіцца толькі здзіўляцца і шкадаваць, што паэт з такім талентам выпускае ў свет сваю першую кнігу праз трыццаць год пасля паэтычнага дэбюту на старонках рэспубліканскай перыёдыкі. І болей таго, выпускае па настойлівай просьбе сяброў.

Зусім няпадаўна адзін за адным глыбоцкія паэты выдалі свае зборнікі — Марыя Баравік, Алесь Жыгуноў, Тамаш Ляшонак. Пытаюся ў Віталя Гарановіча:

— А ты што сядзіш?

— Ат! Якія там у мяне вершы? — адмахнуўся.

— Навошта пішаш тады?

— На душы неяк святлей, лягчэй становіцца...

А пазнаёміліся мы даволі нечакана. Прыязджаю ў родную вёску, прыбягае пляменніца са школы ў захапленні: «У нас новы дырэктар! Такі малады! Прыгожы! І — вельмі добры!» Кіраўскую школу выпала самому канчаць. Наведаўся. Сустрэўся з Віталем Рыгоравічам. Каржакаваты, удумлівы, са спакойным разважлівым голасам, ён неяк адразу выклікаў сімпатыю. І асабліва ўзмацніў яе клопатамі пра родную мову.

Дарэчы, відаць, ніхто другі на Глыбоччыне не зрабіў дзеля яе адраджэння, колькі ён. Узначаліўшы неўзабаве трэцюю гарадскую школу, перавёў першыя класы на беларускую мову навучання. Не сілком, не валявым загадам. Проста, здолеў пагутарыць з кожным бацькам, знайшоў чым пераканаць. Яго палохалі: «Пачакай, міне год-другі і развaляцца твае беларускія класы!» Але такому прароцтву не выпала збыцца.

Сягоння, калі зноў-такі актывізаваліся захады да пераходу на рускую мову навучання, дырэктар Віталь Рыгоравіч Гарановіч звярнуўся да бацькоў: «Напішыце заявы, хто б жадаў, каб вашы дзеці навучаліся не на роднай мове». Напісаў толькі адзін чалавек.

Поўная духоўнай цеплыні атмасфера ў яго школе. Кожны, каму патрэбна дапамога, на воку дырэктара.

— Хлопчык адзін, сірата, не прыйшоў на заняткі! — скардзіцца пры сустрэчы.

— Дык ёсць жа класны!

— Не, тут мне самому трэба разабрацца. Паеду...

Здзіўляешся, як у такіх умовах, пры такой паўсядзённай занятасці знаходзіцца час для паэзіі. І не проста для вершаўадпісак. Яны ў Віталя Гарановіча — частка яго душы.

Усхвалявана ўслухоўваецца яго чуйнае сэрца ў трывогі нашага складанага жыцця, шукае падмацунку Духу на спаконвечных сцежках гісторыі, жадае і верыць — Айчына годна панясе сваё старажытнае імя ў будучыню, бо агеньчыкі гэтае веры ў светлых вачах яго вучняў. Да іх непасрэдна, да кожнага з нас прамаўляе паэт:

*Ад бяспомных душа абароніць*
*Мову нашу і род-карані,*
*Дзе світае меч гнеўнай Пагоні*
*І Грунвальда славутыя дні.*

**УЛАДЗІМІР САУЛІЧ,**
*драматург, член Саюза беларускіх пісьменнікаў*

## САРАКІ

Неба закружылася ад птушак —
Дзень вясновы ладзіць саракі.
Са шпакоўняў пух старых падушак
Вымятаюць крыльцамі шпакі.

Ды жаўрук, натрэсшыся ў разоры,
Б'ецца ў сіні, нібы матылёк.
Грак варонім стаў парламенцёрам —
Ў дзюбе носіць белы ласкутох.

Чаек бела-чорныя цяльняшкі
Тут і там мільгаюць угары.
Галкі, як маўклівыя манашкі,
Аблятаюць ціхія двары.

У гняздзе, нібы ў чалме, бусліха
Дрэмле пасля доўгай чарады.
Кулічок, як самалёцік, ціха
Сеў ля цёплай зброснелай вады.

Разадрата зноў гаёў улонне
Крыкам сойкі, строкатам сарок.
Саракі пад парасонам поўні
Развязалі выраю шнурок.

## РОДНЫ ДОМ

Сюды сышліся ўсе дарогі,
Тут мае ростані жыцця:
Масніцы рыпкае падлогі
І зноў на покуці куцця.

Тут да драбніц усё знаёма:
І стол багаты для гасцей,
І печ, бы гаспадыня дома,
І цёплы круг бялюткіх сцен.

Пад столлю кміну пук духмяны
Ў суполлі з вязкай каўбасы,
Цыбуля жгутам саламяным
Свае звязала валасы.

Бярозы пах і пах аеру,
Глыток сцюдзёнае вады.
Трымай для шчасця насцеж дзверы,
Як і падкову — ад бяды.



## БАЦЬКУ

Ты уцалеў. Я сын вайны салдата.
«Шчаслівы,— гаварылі,— бо жывы...»
А мне карцела з бояззю пакратаць
Пустыя два заўсёды рукавы.

І з радасцю карміў, нібы малога,
І суцяшаў, як боль крамсаў твой твар.
А людзі зноў: «Нямала ці нямнога,
Хоць і без рук, а ў хаце гаспадар».

Не грае наш з вайны стары гармонік,
Сказаў касу чамусьці зняць з гары.
Ды цішыня, нібыта вечны помнік,
Усемагутнай сілай на двары.

## КУПАЛЛЕ

Купальскія кастры пад рана на Івана,
Шугае зорны рой зіхотна ў вышыню.
І ліпеньская ноч сваім дзявочым станам
Лагодна туліцца к купальскаму агню.

Жыцця маладзічок, час папараці-кветкі...
Купалля грай — імгненнем залатым.
Ды ўсё ж да скону год я застаюся
сведкам
Далёкае пары у часе маладым.

Нагульвалі сады свае плады пад сонцам,
Касцы, бы журавы, пад самы травакрай.
Прастор у сіўчаках, як немаўля ў пялёнцы,
І падрастаў ад грому пазарэчны гай.

Кіпелі зноў віры ад спінаў загарэлых,
Спраўлялі вадавей дзятва і юнакі.
А вечарам кастры паганскія гарэлі,
Гады плылі, нібы дзяўчат вянкі.

Ноч-чараўніца, дай расы напіцца,
З рук-промняў сонца вусны наталі.
Дымком кастра б гаркавым прычасціцца,
Нібы дыханнем роднае зямлі.



## МАЯ ПРОСЬБА

Народзе, прашу: не формай салдата,
Не срэбрам адкупнай багатай рукі,
А праўдай і мужнасцю адваката
Мову сваю зберажы на вякі.

Слова Скарыны і песню Купалы,
Мову-салоўку, гаворку-брую
Абарані ад знішчальнай навалы,
Ўклаўшы у слова душу сваю.

Змове шыпячых, глухіх, выбуховых
Поўнагалосся струной загучы.
Толькі ад гэткага наступу мовы
Ў цень пададуцца ўсе крумкачы.

## У ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

Не бачылі вочы мае жахаў лютай вайны,
Дзякуй, лёсе, за гэта!
Ды ўсё ж не лягчэй дзень пры дні
Бачыць бацьку з рукамі у снах,
Хату нашу ў агні, што далей ад дарогі
Зноўку складзеным зрубам
Зірнула на сонца.
І сяброў-аднагодкаў, калісьці вясёлых,
Дзе ні ўзрываў, ні смерці,
Ні новых калецтваў бясконцых...
На акне бальзамінкі у касках
(Такая рэальнасць жыцця)
Чырванелі, як кроў, кожны раз
Перад Днём Перамогі.
Раніў пальцы, ды болю не чуў,
Прыбіваючы сцяг,
Хоць дрыжэлі-трымцелі на драбіне
Дзіцячыя ногі.
...У суседзяў журба —
пахаваны афганец-сынок,
Апусцела з цімураўскай зоркаю хата.
Пыл Саланга асеў на магільны
узлобак-грудок.
...Наша Лепшае, Вечнае, Майскае Свята.



## БЕРАЗВЕЧЧА

**Па дарозе на Браслаў ля Глыбокага ёсць брацкая магіла, якая дала апошні прытулак тысячам савецкіх людзей і 1,5 тысячы італьянцаў, якія былі расстраляны фашыстамі ў 1942 годзе.**

Бяроз вечалле. Беразвечча,
Нібыта ўзведзены курок...
Тут лёсу горкага сустрэча,
Магілы, горасны Барок.

Ахвяр самотная паляна,
Гадамі сцёртыя груды.
Тут беларусам і рымлянам
Стаў бор як чорны знак бяды.

На гэтым месцы ўсім балюча,
Будзь літасцівым, час, прашу.
Тут памяць, быццам дрот калючы,
Сціскае сэрца і душу.

Слязой сплыве агарак свечкі
Ў далонях стомленых людзей.
Худзенькія уздрыгнуць плечкі,
І хтосьці кветкі пакладзе.

## ДУБ ГЁТЭ

**У канцлагеры Бухенвальд фашысты падвешвалі вязняў за ногі на дрэве, пад якім часта адпачываў пры жыцці вядомы нямецкі паэт Гётэ. Палонныя ад такіх катаванняў паміралі.**

**Праходжу праз турэмныя вароты:**
**Вось гэта дрэва — дуб любімы Гётэ,**
**І тут яго юначыя сляды...**
**«Вады... Вады...»**
**Калючым чорным дротам**
**Смяротнік лагера падвешаны канаць**
**І харкае адно крывавым ротам.**
**Зноў цішыня...**
**І Гётэ малады...**
**Зноў дуб хавае светлыя гады**
**Асеннім часам, лісця пазалотай**
**Свабодных думак неўміручых Гётэ...**
**Глухі удар хлыста і цяжкіх ботаў,**
**За смерцю смерць,**
**І стогну больш няма.**
**Для ката не занятак, а работа,**
**Звярыная прафесія — вайна...**
**Стаю маўкліва я на сцежцы вузкай**
**Ля свежых руж і памятнай пліты:**
**Журба Хатыні нашай беларускай**
**І Бухенвальда абеліск святы...**



## ПЛАЧ БУХЕНВАЛЬДА

**Ненажэрная печ,**
**Сэрцаў колькіх магіла,**
**Ты крывёю гарыш,**
**Сэрца паліш агнём.**
**Дужка шэрая плеч,**
**Дзве рукі на паўсілы,**
**Пасівелая маці**
**З нямым дзіцянём.**

**Што так спраўна чадзіла,**
**Цяпер жа астыла.**
**Шэры попел, як снег,**
**Ды не тае вясной.**
**Ты нянавісць ва мне,**
**Маладым, спарадзіла,**
**І любоў да жыцця,**
**І пакуту навек.**

* * *

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прынясла...
*Максім Багдановіч*

Зачараваны вершамі, Максім,
Іх зорны дух паўнюткі юнай цноты.
І толькі ночы жоўта-сіні дым
Блакітным пухам шэпча сэрцу ноты.

А неба ў пацерках адкрыта зіхаціць
І над нямой патоляю зямною
То раптам скрыпкай ціха загучыць,
То абарвецца знічкай над табою.

І з кожнай нотай гусне неспакой,
Дрыжыць святло празрыстай Мілавіцы,
Нібы знарок хто кратае рукой
Танюткі шоўк малінавай зарніцы.



ЕРМАКОЎЦЫ

*Землякам, якіх не бачыў*

Паміралі са словам «мама»,
Абяцаўшы з вайны вярнуцца.
Кожны марыў тады таксама
Ў роднай хаце хоць раз прачнуцца.

Цалавалі сыпчак акопаў,
Кулі чуючы свіст шалёны,
Як смяротным свінцовым шротам
Абліваліся батальёны.

І мяняў выраз твар хлапечы
З кожнай смерцю і кожнай ранай,
І шырэлі ад помсты плечы
У салдат-маладзёнаў рана.

Землякі! Не спаткаў я многіх,
Слёзы выплакалі іх маці.
Нам хапіла бацькоў бязногіх
І паўшчасця ў галоднай хаце.

Нібы помнікаў, зрубаў многа
Ды прагалаў на месцы хатаў.
Колькі летаў і зім дарогі
Не вяртаюць дамоў салдатаў!

## МАТУЛІНА ВЯСНА

*Маці Яўгеніі Аляксандраўне прысвячаю*

Цябе унучка назаве бабуляй —
І разбягуцца зморшчынкі на лбе.
Старэнькая, ласкавая матуля,
Як уявіць мне маладой цябе?

Ідуць гады. Старэе сад ля хаты,
Успыхне ўзмежак белым вішняком.
Ці помніш, як садзілі вішню з татам,
А я гуляў шчаслівым хлапчуком?

Пяць год назад мы спілавалі дрэва,
Але шпакоўню ўгору ўзняў вішняк.
І кожны раз сваім сардэчным спевам
Сустрэць вясну не забывае шпак.

Ссамочуся без дому, калі доўга
Я маці радасць не вязу з дарог.
Наскрозь працята позіркам дарога,
Ацеплены надзеямі парог.



## БАЦЬКАЎ УСПАМІН

Прашыты куляй рог пілоткі,
Звон кайстры ад асколкаў мін.
Ад багны рыжыя абмоткі
Сушыў вусаты армянін.

Ірвала ветрам плашч-палатку,
Сляпучы пыл у вочы лез.
Зайграла тульская двухрадка,
Паплыў з махоркай «Паланез».

Шыпелі злосныя ракеты —
Айчыны грозная браня.
А за плячыма на паўсвету
Сінела ў небе цішыня.

## ВУЧНЯМ

Запомніў з вас я кожнага
У профіль і анфас,
Заўсёды засяроджаны
Вучобай мілы клас.

Над сшыткамі з надзеяй
Запозна трачу зрок,
Каб значнаю падзеяй
Быў кожны ваш урок.

Пішу адозву марам
У новыя вякі,
Каб не зляцелі марна
Гады, бы скразнякі.



## МІХАЙЛАЎСКАЕ

Тут прамаўчаць не здолее душа —
Паэту верш, а мастаку карціну.
Прайдзіся па Трыгорскаму спярша,
Як першы раз з каханаю дзяўчынай.

Дубровы Ганібалаў, луг і бор
Над Сараццю крынічнай, нібы срэбра.
А ў Беларусі вязынскія вербы
Нібы сышлі з зялёных гэтых гор.

Нібы ў далёкі той Іерусалім
Паломнікі збіраюцца са свету
Глынуць паветра, як гаючы дым,
І прычасціцца Музаю паэта.

Міхайлаўскага ў сэрцы астравок
(Абрысы мо знаёмыя Альбуці).
Мне дарагі Анегіна куток,
Як і Міхала ў нашым «родным куце».

Сафійска-Святагорскага аблог,
Святыні Ефрасінні і Паэта,
Я вас наведаць і праведаць змог
У лепшы час пагодлівага лета.

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

Вялікі дзень. Вялікдзень на двары:
І ў душах нашых за самотай спеўна.
Хрыстос ўваскрэс! Царкоўныя хары
Гучаць ўсяноч зноў молада-напеўна.

Бальзам святы — лампадаў курадым,
Зямля жывых у суразмове з небам.
І срэбны крыж, як крэмень, для вады.
І хросны ход. І соль з свянцоным хлебам.

Усё ж на Белай Русі Бог жыве,
Мільярдам душ мільярд паставяць свечак.
Мы тут і там, у бездані, свае
І вечныя не прымхамі ў Сусвеце.



* * *

Зямля мая, мая сябрына,
Край даматканых абрусоў,
Шчэ вадзяным скрыпіш ты млынам
І шэпчаш пошумам аўсоў.

Крыляюць тут, як птушкі, дзеці
Сярод гаёў і азярын.
Сюды вяртаюцца памерці
З чужых далёкіх пуцявін.

Дзе гарады, як незабудкі:
Бярэсце, Полацак, Нясвіж.
Дзе Маладзечна з Навагрудкам
І Менск прыгожы, як Парыж.

Ды чорна быль, бы Хірасіма,
І чорны цень яе крыла.
Бяда над белаю Айчынай
Сваё гняздо навек звіла.

* * *

Шчэ месяц жніўны на календары,
І кожны дзень вяско́ўцу у ахвоту,
І не даймаюць зумам камары,
І мёдам перапоўненыя соты.

Вясёлкі зняўшы ўвечары сіло,
Тыднюе поўня зноў на небазоры.
Падворак матчын, бацькава сяло,
Давайце зноў пра восень пагаворым...



МАЕ НАЛІБОКІ

Гісторыя роднага краю
У пушчаў дыханні жыве.
Я голасна лес свой вітаю,
Ён рэхам у госці заве.

Зайду. Мудры мой летапісец,
Лагодна раскрыеш душу.
І я у падвоблачных высяў
Замовы ад згубы прашу.

Знікалі звяроў пакаленні,
З-пад снегу ўсплывалі імхі.
Варылася ў хатах варэнне,
І пахлі грыбамі мяхі.

Хавалі лясоў леснічоўкі
Ад сцюж і нашэсцяў заўжды,
Дрыжэлі купальскія зоркі
На плыні крынічнай вады.

Калі ж ад хвароб ратавацца —
Сачылі жывіцу і сок.
І цеслі мазольную працу
Увенчваў на зрубе вянок.

* * *

Павуцінне коціць ліставей,
Зацугляўшы шорсткія памежкі.
Грыбасей пачаўся, грыбасей,
Зноўку мох салодзяць сыраежкі.

Над астрыжняй скірдаў каўняры,
Грэе восень жоўтыя далоні.
Раніцы з палеткаў у двары
Туманы халодныя прыгоняць.



* * *

Вядзі мяне, дарожка-сцежка,
Ў абдымку родных тупаноў
Да тых аселіц і узмежкаў
Без лебяды і палыноў.

На старадрэвінах шпакоўні
Даўно ад часу пагнілі.
Ды маладыя ўсходзяць поўні,
Дзе мы малечаю былі.

Дакорам стрэне двор сірочы,
Як быццам тут і не жылі.
Агонь слязы прапаліць вочы —
Магіла мамы на зямлі.

Не бацькаў дом — чужая дача,
І новы ў хаце гаспадар,
І ўсё расстаўлена іначай
І ператворана ў тавар.

Мой родны дом, якой кляцьбою
Караць мне лёс за гэты здзек?!
Мне быць асуджаным табою
За здраду сынаву навек.

***

Белыя заплаткі
Конь-мароз скубе.
Коцікі-зярняткі
Пухнуць на вярбе.

Ў ледзяша з застрэшша
Нос зусім пацёк.
З клёну саладзейшы
Сакавіцкі сок.

У хлявах — прыплоды,
Ў хатах — сырадой.
Пахнуць агароды
Бульбай маладой.

Гімн складаюць пеўні
Сонцу і вясне.
Раўчуку ўжо спеўна
У лядовым сне.

Нібы рукавіцы,
Кіне вечар цень.
Сэрцу надзівіцца
Выпала за дзень.



## НА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

Там ермакоўскія віры,
Дзе захад пеўнем жаўтагрудым.
Буслы на дзічцы пры двары
Ускінуць дзюбы, быццам вуды.

Пылок суквецццяў залаты
На пысе прынясе карова.
Вясной трыножылі платы
Пасляваенныя удовы.

І першае ў жыцці кіно,
І кнігі томік у ахвоту.
Марозу шчокі праз акно,
І лівень-дождж у літых ботах.

Як панцыр, чэрвеньскі загар,
І пят парэпаных палітра.
І дзічак-дрэў калючы твар,
Кахання першага малітва.

«Лякарства» майскай крапівы
І смак «бярозавае кашы».
І не ламалі галавы
Над пераходным ўзростам нашым.

Мае маленскія гады,
Як сон у навальнічны ранак.
З крынічкі той глыток вады,
Што гоіць успаміны-раны.

## САФІЙСКІ САБОР

На кручы над плынню Дзвіны
У белле вечнае ўбраны
Стаіш, чысты цуд даўніны,
Як помнік святы палачанам.

Як ветразь спакойнай ракі,
Ўлюбёны ў высокае неба.
П'юць ранку святло жаўрукі,
А ў доле скрозь лашчацца вербы.

Хоць біліся смерчы ў званы
І сцены жагналі маланкі,
Цапы малацілі вайны,
А ты не сышоў на світанку.

Узносіш надзею людзей,
Як колісь падданага люду,
Што вернецца твой Чарадзей
І здзейсніць сучасныя цуды.

Ты ў свеце — Сафійскі сабор,
Сафійка — у Полацку стольным.
Як твой беласценны убор
На твар Беларусі падобны.



## АДКРЫВАЮ СТАЛІНА

Дзень учарашні
Пазбыўся кратаў тайны.
Чытаю страшнае
І адкрываю Сталіна.

Хцівага братазабойцу,
Бацьку берыеўскіх пачвар.
Спрытнага канатаходца
Па лёсах сваіх ахвяр.

Уяўляю па-новаму сёння
Сталінскі лікбез,
Як ліквідацыю безабаронных,
Віны і прычыны без.

Асатанелым культам,
Тэрорам яжоўскіх мес —
Расія рукою-кульцяй
Асвойвала прагрэс.

Словы з іржавай акалінай
Пад духавога медзь:
«За Сталіна... Сталіна... Сталіна...»
А на парозе смерць.

У чорных дамах карыда
Ў шаленні людской крыві.
Час, непадкупным гідам
Маску хімер сарві.

Нелюдзяў праклінаю
Сотнямі Курапат.
Сталіна адкрываю,
Шляху няма назад.

## МЕТАМАРФОЗЫ ЧАСУ

Дачушка ў бацьку, сын у маці,
Сучаснасці пярэсты лік.
Грыміць-шалее на асфальце
«Хэві метал» — распусты крык.

Працяў наскрозь рок Музы сэрца,
Займеўшы крута сан пашы,
І як на лакмусу паперцы
Кардыяграма іх душы.

Яшчэ сканае ў душах рок,
Што загучэў высокай нотай.
Бесчалавечнасці наркотык
Зрабіў к ахвярам першы крок.

Як з белых яблынь чорны дым,
Над цнотай юнаю глумленне.
Разгульна ў свеце маладым,
У істэрыі спіць сумленне.

І стыне ад вар'ятаў кроў
У сэрцы цёплым чалавечым,
Калі з падонкам пры сустрэчы
Сустрэць жадаеш лепш звяроў.

Бацькі твае хто, ваўкалак?
Ў стыхіі дзікай калатнечы
Час наш пакуль згінае плечы,
Ды не сагнуць людзей аднак.



3. Зак. 5035

## У ХОЎХЛАВЕ

*Памяці Сымона Буднага*

Я да мудрасці кніг далучыўся
На зямлі, дзе жыў слынны друкар.
Праз кірыліцу свет мне адкрыўся,
Што саткала славянскі буквар.

Уяўленне вяло: зноўку Будны
Над друкарскім схіліўся станком,
Дзе шугалі старонкамі будні,
Пахла фарбай і свечкі дымком.

Утравеў, абязлюдзеў гасцінец,
Сведка тых векапомных гадоў.
І касцёл, як абрубак-мезенец,
Ля сучасных катэджаў-муроў.

На сцяне памінальная дошка,
Пад сцяною — загрыўкі травы.
Побач школа. І літасцю боскай —
«Аз» і «букі» на вуснах дзятвы.



## ПАМЯЦІ НЕМАЎЛЯЦІ

Спіць дзіцятка роднае
Непрабудным сном.
Раніца халодная,
Вусціш за акном.

Ком сцінае горла —
Чорная жуда.
Птушанятка ўмёрла,
Выпаўшы з гнязда.

Выпаўшы з гняздзечка
Роднае сям'і,
Як іскрынка свечкі,
Зернетка зямлі.

Сохне сэрца маці,
Бацькава — гарыць.
У аціхлай хаце
Цяжка гаварыць.

Без грахоў і злосці —
Сонечным святлом —
На дзянёк у госці
Заляцела ў дом.

І, аддаўшы родным
Ручанькі цяпло,
Адыходзіць згодна
Ў вечнае жытло.

Будзь, зямліца, пухам
Дзённа і ўначы,
Да Святога Духа
Дзетку далучы.

Станецца ў дамоўцы
Цёпленька рукам,
Мякенька галоўцы,
Роўненька нагам.

Атам-яд Чарнобыля
Знішчыў немаўля.
Стала непрыгоднай
Для жыцця зямля.



## ГРЫНПІС

Іх жыццё, як чыстапіс,
На зямлі радком зялёным.
Рэй марскі вядзе «Грынпіс»
Праз вар'яцкія праклёны.

Апантаным — да святла,
Чысціні і прыгажосці.
Іх завуць Маруруа,
Дзе звяроў няшчасных косці.

Сохне кволая зямля
Ад пустыняў і бязлесся,
Хлебадайная ралля
Атам спеліць на Палессі.

Росаў чысты рушнічок
Не прывеціш часта ўлетку.
Усіх ласёў — на шашлычок,
Рыбу рэдкую — у сетку.

Час нябыт, як вечны сон,
Прадвяшчае ўсім зямлянам.
Тае, нібы снег, азон,
І зямля — адкрытай ранай.

Шляху ўсё ж няма назад,
Час мінецца быстрацечна.
Асцярожна! Ў душах яд.
Жыць пад небам небяспечна.

## МАЯ РАДАСЦЬ

Колькі сэрцаў трымаю ў сэрцы сваім —
Цэлы клас!
Колькі дум абуджаю пытаннем адным —
Не злічыць!
Колькі доўгіх начэй не дасплю,
дарагія, з-за вас,
Каб маленькае кожнае сэрца
жыццю навучыць.
Адпачну я ля сшыткаў,
разгорнутых, быццам душа,
Кожны раз з хваляваннем
трымаю аловак над цёплым радком.
І азвоніцца памяць,
бы кропля-капеж з ледзяша.
І ўзіраецца сэрца
у светлыя вочы крадком.



## ГЛЫБОКАЕ

Хто даў табе імя такое?
Не скажа час, маўчыць панура.
Струхнеў каўчэг разбіты Ноя,
Вякоў пранеслася віхура.
Сівым здаецца час далёкі,
З якога стаўся ты Глыбокім.
...Ды прыгадаю светлы ранак,
Русавалосых глыбачанак
З карзінамі суніц баровых,
Заўсёды вострымі на слова.
Кахання першага вандроўкі
Па ціхіх вуліцах Мядзёлкі,
І светлы час тае сустрэчы
Ля белых гмахаў Беразвеччы.
Драздовіч, Корсак і Буйніцкі
Пілі душой з тваёй крыніцы.
А ля ваколіц сіні лён,
І ўсюды дух наш беларускі,
Дзе калісь з арміяй французскай
Кастры паліў Напалеон.
Відны, як вочы, азяркі
З палёту вышыні Сухога.
Крыжамі ўзносішся да Бога
Усе пражытыя вякі.
Даўжэйшы твой паўночны цень.
Ды гронкай здзівіш вінаграду.
Цябе, заснежаны ў каляды,
Вітаю светла кожны дзень.

## ЧОРНЫ РУЧЭЙ

**Між алешын, кустоў,**
**Дзе пяе салавей,**
**І шуміць і грыміць**
**Срэбразвонны ручэй.**

***Я. Колас***

У глыбокім яры
Ўецца шэрым вужом,
Рэжа хмыз, гушчары,
Бы сталёвым нажом.

Льецца Чорны ручэй
І ў паданнях жыве,
Ад староннiх вачэй
Сны хавае свае.

Мёртвай раніцай п'е
Промень сонца слязу,
Не расплюшчыць свае
Вочы дзень на расу.

На яго берагах
Пах чарніц і груздоў.
На дубовых рагах
Звон цяжкіх жалудоў.

Цёмнай ночы чарней
Ў зімні вечар вада.
Чорны людзям ручэй —
Чарнабыля бяда.



* * *

Не бойся рукі апячы аб хлеб,
Бойся горшага —
Хлеб апячы аб рукі.
Не па кніжцы
Пазнай сакрэт
Хлебаробскай бацькавай
навукі.

Без пагарды глядзі на плуг,
Каб успомніць,
Як пахне поле,
Каб табе з-за мужчынскіх рук
Чырванець не прыйшлося
ніколі.

Будзь патрэбным у справе любой,
Што зямлю упрыгожыць
працай,
Каб застацца
Самім сабой,
Чалавекам застацца...

## СЯРГЕЮ ЯСЕНІНУ

Ты вырас там, дзе хораша ў жніво
Жанкі спявалі ў полі за ракою,
Дзе, як да маці, да зямлі сяло
Прыціснулася цёплаю шчакою,

Дзе буйна кветкі сеялі узор,
Каціўся ветрык лёгкі па дарозе,
І ноч, бы дзень, іскрылася ад зор,
І месяц расцякаўся па бярозе.

Ты любаваўся краем дарагім,
Празрыстым небам, роснымі лугамі,
Як закаханы, клёнам маладым
Дзівіўся басаногімі гадамі.

Але маленства кветкай адцвіло,
З-пад ног сцяжынка шэраю зязюляй
Рванулася у поле, за сяло,
Спаўзла слязінкай па шчацэ матулі.

І толькі у вершах ты шчаслівы быў
Спаткацца зноў з бярозавым туманам,
З азерцам ціхім ў сонечны разліў,
А ў навальніцу — з дубам-веліканам.

Як слынны дар, дзіця прыроды, сын
Зямлі сваёй, ты шмат цярпеў знявагі.
І колькі б ні гарчэў яе палын,
Яна твая на ўсіх вякоў прасцягі.



* * *

Верасень — вера асенняя
З сумам і лёгкай тугой.
Скласці б гады, як бярвенне,
У зруб маладосці маёй.

Хай без страхі і без рамаў,
З ганкам-жарнавіком,
Але з маладою мамай
І татам-франтавіком.

З ростанню — не пакараннем,
З глыбокім салдацкім сном.
Шчаслівага зноў вяртаннем,
Заручын дамашнім вінам,

Ды не са струхлелай брамай,
Зарослай шыпшынай густой,
Ужо незваротнай мамай
І бацькавай лаўкай пустой.

## ПРЫЗВАННЕ

Хацеў калісь ты быць акцёрам,
А стаў шафёрам.
Ты марыў аб актрысах МХАТа —
Пайшоў к даярцы ў сваты.

І не крыклівыя рэкламы,
А пісьмы мамы.
Замест шэкспіраўскае ролі —
Два кузавы калійнай солі.



## ВЯКАМ

Упаў лісток пажоўклы на асфальт,
Не лістапад, а ліпень на пачатку.
Мо восень у купальскі заркапад
Пад ногі лету кінула пальчатку.

Магчыма, выпад позняе пары,
А раптам жарт, дзіцячае свавольства.
Ды сенны дух у чыстыя двары
Вязуць вазы, бы ў восені пасольства.

Сляэінка-знічка, дочка раўчуку,
Як невідзімка, згубіцца ў лістоце.
Віхор падскоча к хмарцы на кійку,
Каб спрасці дождж на вечным калаўроце.

З дарогі жнівень ступіць на парог,
Уваліцца, нібы дзяцюк, у хату.
І лета, спёкшы на Іллю пірог,
Адорыць шчодра восенню багатай.

* * *

Чакаць бяды не трэба —
Яна, як нечаканка,
З зіхотных высяў неба
Жагнае, як маланка.

Шукаеш апантана
Вугельчыка-цяпельца.
А боль — адкрытай ранай,
І не хапае сэрца,

І чэзнуць нерваў сілы,
Рука сама ў адчаі
Нацельны крыжык з шыі
З надзеяю сціскае.



* * *

Вульбоўнік пах...
Мяне жыццё пазвала
У юнацкі шлях
жыццёвага вакзала.
Мой родны дом —
майго жыцця перон,
Дзе маці доўга
мне рукой махала
І лісцем жоўтым
асыпаўся клён.

* * *

Не, не маўчыць злавесніца вайна,
То тут, то там ашчэрыць зноўку зубы,
Паўстане ноччу на дарозе дня,
Маленства нечае скалечыць
Ці загубіць.

Яшчэ нярэдка, прычакаўшы час,
З вар'яцкім шалам разарвецца міна.
Гадзюкай тлустай выпаўзе фугас,
Граната ўздрыгне з лютасцю звярынай.



ЗАЛАТОЕ ВЯСЕЛЛЕ

На руцэ, бы месячык,
Залаты пярсцёнак.
Госці ўсе не месцяцца,
Аж асіп гармонік.

Сват ручнік накінуў,
У карунках сваццця,
Кот і той пакінуў
Печ — вяселле ў хаце!

За сталом на куце
Са старым старая.
Ды усе завуць іх:
«Пара маладая!»

Хоць жаніх бялюткі,
І яна — не зорка,
Ў хаце, як не суткі:
«Горка! Горка! Горка!..»

Радасць, нібы вулей,
Позірк — вугалёчак:
«Любая Настуля» —
«Любы Васілёчак»!



4 Зак. 5035

***

Ранак, як рамонкавы пялёстак,
Забялеў пад сонца капяжом.
Першародным быць цяпер няпроста —
Чыстым ветрам, снегам ці дажджом.

Ды няўпрост застацца чалавекам
Сярод здрады, пошласці і зла.
Не пылінкай у святле малекул —
Хоць адной малекулай святла.

Калі цяжка — мне, майму народу,
Калі лёгка — зноў з народам жыць.
Не губляць галінкі радаводу,
Першаісным да скanання быць.



## НА ВЫСТАВЕ ЗІМОВАГА БУКЕТА

*Н. У. Пястун*

Разгар зімы. І сонейка ўстае,
Нібы малое соннае дзіцятка.
І толькі ноч расцягвае свае
Мяхі са скрыпам, бы пяе двухрадка.

І раптам лета ціхі астравок.
І ажывае сэрца ад маркоты:
Тут прыгажосці яркай абразок
І мрояў час высокага палёту.

Не крокі — сэрца тахкае ў цішы
Ля гэтых чараў, незямных суквеццяў.
І дзіўная фантазія душы,
І Божы дар адзін у Божым свеце.

* * *

Гады — плыты Жыцця ракі
У крыгаход і навальніцу.
Душу то ўздымуць жаўрукі,
То з неба скінуць у крыніцу.

Ці фрэскі весняе пары,
Ці восеньскіх дажджоў мярэжы.
Нібы званіцам званары,
Жыццю істотай прыналежу.

І радасць велічы быцця
Каханым, вернікам ці сябрам
На кон пастаўлена жыцця,
Пазначана бясцэнным скарбам.

І лёткай ластаўкі крыло,
Мільгнуўшы сполашна над летам,
Як невідушчаму святло
Прысніцца ў сне чароўным светам.



## ДУХОЎНАСЦЬ

Можа, дух ты нячыстае сілы,
Што ў паданнях, легендах жыве?
Ці сугнеем стаіш ля магілы,
Распыляючы цені свае?

Мо дыханне дрыгвы ці грыбніцы,
Што ўмлеўна стаіў санцапёк?
Ці туман веснавы над крыніцай
Пад малочнаю ношай аблок?

Ты — парыў да людскае спагады
І купалаўскі том на стале.
Ніцавока міргаюць улады
На тваім цудадзейным святле.

* * *

Пасеяў снежань белую расаду,
Марозік звесіў ногі са страхі.
Вятры снягі арфуюць у прысадах,
Закінуўшы на неба кажухі.

У цёплай шапцы бэз на паваротцы
Скубе сянцо пахучае з вазоў.
Маўкліва коні, як першапраходцы,
Ступаюць з млосным скрыпам палазоў.

І вёска, абапёршыся на плоце,
Дымком над хатай, як брывом, кіўне.
Крамяны яблык ледзянее ў роце
І набліжае да вясны мяне.



* * *

Той стаяў снег, што нам адкрыў лыжню,
Ды след яе ў маёй душы згубіўся.
І позірк твой з таемнасцю агню
На веях часу цьмяна астудзіўся.

Наш белы дом юнацтва на дваіх
Я ўсё будую шчэ ва ўзросце сталым
І абыходжу той злавечы міг,
Калі навек, было, чужою стала.

Твой позірк спапяляючы нашу
У мроях-снах, у адзінотнай скрусе.
Даруй мяне, адзіная, прашу,
Цябе сустрэць шчаслівую баюся.

## ШТОГОД

Зімы снягі атуляць, як раней
Па-мацярынску лістапада плечы,
З'інелы лес чакае зноў саней
І прыгаршч зор над галавой штовечар.

Зямля, нібыта поўначы мальберт,
Рукою веі творыць закахана
І на выставу студзеня партрэт
Пад самы люты скончыць апантана.

Знядужыцца мароз к сакавіку,
І красавік квятасты, як цыганка,
Пазалаціць працягне зноў руку
Да цёплых промняў майскага світанку.



## КАЛЯДЫ

Старая Божай ласцы рада,
Кіёк сукасты — у руку!
Святыя звонкія каляды —
Ідзе наўпрост па цаліку.

Вадзі казу, вяжы вароты.
Задор-віхор і снегу рэзь.
Гані чарцей усіх з балота,
Ды толькі сам туды не лезь.

Круці, мяцеліца, аборы,
І лыка снежнае дзяры,
І вышываныя уборы
З акон для лютага бяры.

Спачыне сонца ў шэрых хмарах,
Віхура ўскружыць да нябёс.
І на лядовых коўзкіх нарах
Праспіць да весніх дзён мароз.

* * *

Зімой віхурна ўздыбяцца снягі,
Каб ростанню забыцца ў траўным леце.
Аддам кахання грэшныя даўгі,
Пакуль душа мядуе ў буйным цвеце.

Пярсцёнкам дрэва ацугляе год,
Рукі папросіць лістапад у веі.
Даруй, адолець столькі перашкод
Я да цябе, далёкая, не ўмею.

Кідаеш мне: «Няма ў цябе душы,
Ты эгаіст і выдумшчык бясконцы...»
Ды не зыначаць слоў звадыяшы —
Я верай той, хто прагне крыллем сонца.

Я адгукнуся на слязу-усмех,
Нібы пяршак, глыну расстання скруху.
І шчасця боль не для начных уцех,
Як крыж, нясу сягоння ў завіруху.



## ПАРА РАЎНАДЗЕНСТВА

Не хмарся, зіма, на вясеньку-нявесту,
Крыўдуй — не крыўдуй, а рыхтуй каравай,
Няхай падрастае вясельнае цеста
Для месяца з сонечнай назваю Май.

Распусціць вясна між бярозаў пралескі —
Глядзіць месяц вокам з-пад ночы брыва,—
Прымерае заўтра дажджу занавескі,
І зелена-порстка падскочыць трава.

У небнай сінечы святочна ўрачыста:
Пара раўнадзенства на шалях вясны —
І ранак ад сонца з крылом залацістым,
І гром па-над хатамі з пахам лясным.

* * *

Трывожна-сумны дзень, калі
На сэрцы ледзяшы спакою.
У рай аслепленых вялі,
І хтосьці іх жагнаў рукою.

Забіўшы Бога, сам як Бог,
Сваяк вар'ятаў — культ асобы,
Пад прыкрыццём ваеннай робы
Стаць чалавекам больш не мог.

ГУЛага шэрыя муры,
«Аўроры» мірнай аканіцы.
Царквы разбітыя званіцы,
І пад крыжамі святары...

Вісеў фанатыкаў кулак
Над галавой сівой Еўропы...
Ступалі пругка далакопы —
Хавалі чалавечы шлак.

Гнілі ідэі карані
У плесені, гадзючай твані.
І адыходзілі міране
У шлях апошні ад хлусні.

Ды нечаканы выспеў час,
Заспеў жывых на паўдарозе.
Упершыню прачыста ў Бозе
Ён выпрабоўвае і нас.



НАСТАЎНІКУ

Добры дзень!
Дзень у дзень з табой
Носіць ранак у ранцы школьнік.
Дзе дарога, як компас твой,
Самых светлых гадоў настольнік.

У грудзях ад гаючых надзей
Першай шчырасцю і даверам
Прарастае зярняткам дзень
І радком на паперы.

На узвысях таемных мар
Плыў чаромхавы майскі вырай.
Ты настаўнік і ты шкаляр,
Хоць і бачыш свет гэты шырай.

Убярэ жоўта восень сады,
Азірнешся — міне паўвека.
А ля веснічак крок малады —
Заставайся у ім чалавекам.

## АБ ХЛЕБЕ

У хлебе святая памяць аб маці
І Ленінградзе.
Нібы ў пятлі, заціснуты горад.
Гола́д.
Людзі збіраюць крошкі.
«Яшчэ б трошкі!..»
Вось-вось захліпнецца
сэрца ў дзіцяці.
Маці!
«Ма-м-а-а!»
Тваімі рукамі засеяна поле.
«Хлеб-а болей...»
«Сынок, памаўчы, мілы...» —
ужо над магілай.
Круцяцца жорны.
Белы і чорны.



* * *

Нябога. Да Бога
Душа ад цела паляцела,
Нагамі да парога
Выносяць цела.

Дождж крапае на твар,
Загар
Бы з воску. Вёска
Аддасць як дар

Зямлі. Бы зернейка ў раллі,
Узыдзе крыжам...
Жыццё — як не жылі,
Ды к Богу бліжай.

## ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ

Люцень не дужа халодны, дарэчы.
Вечар сустрэчы, месца сустрэчы.
Школа, ты Меккай сапраўднаю стала,
Месца паломніцтва — школьная зала.
Слёзы на зрэнках, бы іскаркі свечкі.
Вечар сустрэчы, радасць сустрэчы.
Шал маладосці, мудрасці веліч.
Шчасце сустрэчы, памяці вечар.



* * *

Дачакаўся вясны
І штовечар хаджу да каліны,
Мне здаецца, зямля
Адагрэе спатканняў сляды.
Мы спаткацца з табой
Чуеш, любая, зноўку павінны.
Як захмелена вабяць
Малочнай зіхотай сады!

Зноўку зможа ў душы
Прарасці зерне светлай надзеі.
Хай бунтуе ва ўсю,
Вар'яцее вясна ў крыгалом.
Веру я, што шчымотай
Абудзіцца ў сэрцы нядзеля
І не згасне кіпець
Пад паўдзённага сонца крылом.

## ПРЫЗНАННЕ

Шчымотна бруіла каханне:
Пад бацькавым майскім акном
Чаромхі бялюткай дыханне,
Бярозы з зялёным сном.

Піў шчасця брую штовечар,
Шчаслівым быў кожны дзень,
І нават тады, калі вецер
Дажджы над страхой прадзе.

Як люцень, мяце завіруха,
Спякотай бяссільны цень.
Мне б толькі шчасліва слухаць
Малітву тваіх грудзей.

Адданыя ёй павечна,
П'ём хмельна бярозавы дым.
І горнецца Маладзечна
Маем сваім маладым.



## ПРАДАЎЖЭННЕ

Дзядулю
Скасіла куля пад Берлінам.
Трымаю немаўлятку сына,
Трымаю унука.
А, можа, зноў працягне
бацька рукі
І, як мяне, сыночка панясе.
І будуць слізгаць цені
па расе.

Пад сонцам
Шчаслівыя бясконца
Я, сынок і тата...
Няпраўда, што ў сэрца
з аўтамата!

Вось пісьмы усе яго,
Знаёмы почырк...
І дзедавы у сына вочы,
І родная радзімка на шчацэ,
Рука ў руцэ.

* * *

Мае сцюдзёныя віры,
Драўлянкі-рэчачкі, крынічкі,
Дзе рассяліліся бабры
І бор усыпалі лісічкі.

Дзяцінства босыя сляды.
Дзе Ракаў ракамі багаты.
Дзе, прарастаючы з вады,
Вясёлка грэлася над хатай.

Зімоўя цнота, мая шал,
Капежкі лета, шчодрасць саду.
Разварушылася душа
Ва ўзросце самым лістападу.

А сэрца ў сталасці шчыміць.
І ў снах палохаюць прывіды.
Не мне баліць — зямлі баліць
У пастцы радыенуклідаў.



* * *

Вязуць бярозавыя дровы —
На доле рытвіны, груды,—
Вязуць праз рэдкія дубровы,
Вязуць штодня, вязуць гады.
А з імі спеў і шум гаёвы,
Звяроў гарачыя сляды
Вывозяць з лесу назаўжды...
І плачуць сцішана тады
Лясы, схіляючы галовы.

* * *

Я адчуваў сябе найбольш багатым,
Калі звінелі косы ў лугах,
Калі над возам месячык гарбаты,
Бы цераз грыву жоўтая дуга.

А потым трошкі стомлены дарогай,
Забраўшыся на пахкі сенавал,
Прыемна чуў, як аціхаюць ногі,
Як мякка ў сене тоне галава.



## МОЙ КРАЙ

Клёкат бусліны
Над Нараччу сіняй —
Гэта мой край.
Зорныя межы
Над Белавежай —
Гэта мой край.
Песні ў Заслаўі,
Вязынкі слава —
Гэта мой край.
Вёскі пад Глускам,
Род беларускі —
Гэта мой край.
Хлеб Прынямоння,
Віцьбы далоні —
Гэта мой край.
Вечар расстання,
Ранак вяртання,
Любы наш край.

## ПЕРШАЕ КАХАННЕ

На гарачых вуснах май
У маёй абранніцы.
Ты мяне не праганяй
Аж да самай раніцы.

Лепш, адданая, маўчы
Гонарам дзявочым,
Мне б вачыма апячы
Чараўніцы вочы.

Мне б адчуць, як пахне бэз
На губах самлелых,
Прытуліцца да цябе
Шчырым і знямелым.



* * *

Вясны замглёны рэдкі дзень,
Ад ветру сэрца астывае.
Ты, разняволеная маем,
Такуеш цёпла ля грудзей.

Слатой няспеўна салаўкам,
Раз-пораз сонца промнем кіне...
Мая адзіная багіня
Маім даверана рукам.

На скрыжаванні твар у твар
Пад сонца ўспышкай здымак ночы:
Твае заплюшчаныя вочы,
І вусны аддаюць нектар.

* * *

Дажджу жадаюць — не клянуць,
І кропля кветачкаю стане.
Травінка ўзыдзе, каб глынуць
Расіцы чыстай у тумане.

Так і народная душа
Не звяне ў пошласці і глуме,
Калі зачэрпае спярша
Жывой вады ў крынічным шуме.

Дажджынка ў камень пападзе,
І разляцяцца светла пырскі.
Маіх дзяцей, маіх надзей
Вятры не выкінуць з калыскі.



* * *

Не вярнуць свайго юнацтва
І дзяўчыны не вярнуць.
Помню ток шчаслівых пальцаў,
Як баяўся іх крануць!

А далёкае так блізка
Пламянеецца ў душы.
На сцяжыне шчасця слізка —
І завеі, і глыжы.

Сарамлівае святое,
Бы крышталю тонкі звон.
Я жыву адной табою,
Юнай памяткаю дзён.

Вялікосны год адыдзе
Ў звітак часу, у «было».
Поўня новая узыдзе
Ліць бяссонніцы святло.

***

Ты ў жыцці, нібы тайна,
Кветка-папараць ў снах.
Пакахаў за звычайна,
Ды заспела вясна.

На пялёстках парошы
У жыццёвай імжы
Я каханне, як ношу,
Пранясу у душы.

Хай цябе заварожыць
Белы май, яблынь хмель.
Свет развеснены Божы
Шмат адкрые зямель.

Шчэ шапочуць паляны
Сонцу, ліўню, траве...
Сэрцаў двух закаханых
Ціха споведзь плыве.



## АЛЬМА-МАТЭР

У бярозкі жоўты ліст у косах,
Верасень у сонечным двары.
Літары свяжуткія, як росы,
На старонцы ў белым буквары.

Тут маленства пружыстыя крокі,
Ад дзяцінства да юнацтва след.
Зазвініць вясна кляновым сокам,
І кахання ўспыхне першацвет.

Дзень у дзень, і школьны век,
як тыдзень,
Прамільгнецца спешліва ў жыцці.
Калі «пяць», то на душы Вялікдзень,
калі «два» — настроем папасці.

І шчыруе школа, як планета,
Адпраўляе вырай кожны год,
Каб вачамі юнага паэта
Зноў прывеціць верасня прыход.

## ПАСЛЯ ДАЖДЖУ

І адплывала навальніца
З дажджом, бы ветразем, за бор,
Нібы пруткамі, бліскавіцай
Карункаў вяжучы узор.

Павылезшы з-пад крылаў маткі,
Стаялі ціха на страсе
Ў гняздзе двайняткі-бусляняткі
І абсыхалі пакрысе.



## * * *

Усё цяжэй пчале знаходзіць кветку
Сярод сіўцоў, не кранутых касой.
Паплыў павук да восені ў разведку
Услед за самалётнай паласой.

І лес, здалося, верасню паверыў,
Надзеў бярозам космы-парыкі.
А за дажджамі праразаюць шэры,
Размоклы дол ізноў баравікі.

## ПАДАЮЦЬ ЯБЛЫКІ

Падаюць яблыкі. Ў яблыкаў сэрцы-зярняты.
Падаюць людзі ад сэрца і вечных турбот.
Што наша восень на страты сягоння багата,
Так, як ніколі, бяднее зямлі радавод.

Як на духу — у вялікім мы вечна жывыя,
Крыж на магіле і крыжык, як знак нарадзін.
След на пяску першы дождж, як заведзена,
змые,
След у жыцці ўсё ж не згубіцца наш
ні адзін.



## ДА ЛЕТА

Скаціўся дзень у сонечным клубку
За небакрай. І вечар па-старэчы
Кладзе туману белую руку
На цёплы луг, як на зямныя плечы.

Венера-зорка, быццам альбатрос,
Штурмуе высі над маўклівым дубам.
Цікаўны месяц вытыркае нос,
Кусае ноч свае нямыя губы.

Пра восень забываеш і зіму,
Хоць на палях каўнерык жоўты жніўня...
Я шапку перад хмараю зніму
І захлынуся нечаканым ліўнем.



6 Зак. 5035

## КОД КАХАННЯ

На душы лагодна стала —
Ты мяне пацалавала.
Шчырасць пылкую жанчыны
Раздзяліла ты з мужчынам.
У таемным засмучэнні
Ты прасіла прабачэння.
Завяла мяне ты ў нерат,
Не пайду назад. Наперад!
Бо прыняў як пакаранне
Тваё цяжкае прызнанне.



## МЕНА

Гэта вам не жарты —
Уладарыць бартэр.

Мена днём і ноччу,
Хто на што ахвочы.

Калі трэба шыла,
Дай кавалак мыла.

Быка на індыка.
Ды ці толькі ж быка!?

А з зарплатай куцай
Ўраз стаўкуць на груцу.

Каб у гэтай мене
Не згубіць сумлення?

* * *

Звезлі лецейка ў стог
Неяк вечарам дужай фурманкай,
Цалавала прастор апусцелы
Да раніцы
Залатая маланка.



* * *

Пад святлом Венеры-зоркі
Ткуць свой майскі паясок
Затравелыя пагоркі,
Дзе, як золата, пясок.

Веснавей, каб не сурочыць.
Узышоў маладзічок.
Беларускай белай ночы
Развязаны каснічок.

І зрываюцца з галінак
У салодкі сон гракі.
Растрывожылі маліны
Маладыя салаўкі.

Цень ад коміна за хатай,
Нібы штык той за спіной...
Ды ніяк не страшнавата
Першай кветчыне вясной.

## НЕЗНАЁМКА

Хто параніў цябе, светлых воч незнаёмка?
Цень блукае які па жаночай душы?
Дзень сшарэў на руцэ
заручальным пярсцёнкам,
Крыўда ў сэрцы пячэ гаркатой анашы.

Можа, слоў звадыяшніцы хітрай маніста
Ці то забаўка мужа да позняй пары?
Твар твой нікне пад небам
вяснова-празрыстым,
Бы за хмараю сонца ўгары.

Не маркоцься нудой і бядой, незнаёмка.
Ты пасланка дарыць незямную красу...
Як сумленка і гордая верніца-жонка
Ты адолееш сумнага дня паласу.

Скінеш ценю вуаль з твару
гордай усмешкай,
І напоўніцца дзень зноў ракой дабрыні,
Зацвітуць пад нагамі сустрэчныя сцежкі,
Ты нядоўгай зімы не віні.



## У ЯЛЦЕ

Тут — белы горад.
Край мой белы
Ляжыць далёка за гарамі.
Там курганы задзірванелі,
Зубры вандруюць там барамі.

Ты — Чорным морам,
Там жа — лёнам
Жыве спрадвеку беларус.
Там не вада, а пот салёны
Прасоліць ветразь і абрус.

* * *

Хачу ў жыцці трывогі —
Няхай у сэрцы звоніцца:
Уноч — пасля дарогі,
Удзень — пасля бяссонніцы.

Трывогу — сэрца вернасці —
Пакуль жыву, як ношу,
Нашу пры безнадзейнасці
І ў светлы дзень харошы.



* * *

Калі твой сын з маленства знаў ласункі,
Любіў расці на бацькавых руках,
Нялёгкім здасца потым пачастункам
Яму жыццёвы пакручасты шлях.

Калі дачка пазнала згоду маці
На смачны блін на ложак як штораз,
Саланаватым будзе у расплаце
Гадамі марна страчаны той час.

Калі ж дзяцей вы гадавалі ў працы,
Вучылі радасць і бяду дзяліць,
Ўспамінам шчырым, ўдзякай роднай хаце
Яны, як шчасцем, змогуць адарыць.

## КАХАННЕ

Што большай моцы на свеце?
Скажуць адны — гэта вецер,
Скажуць другія — вулканы,
Трэція — акіяны.
Могуць назваць навальніцу,
Гром і змяю-бліскавіцу,
Ранак ці мо змярканне,
Стрэчу ці развітанне,
Радасць над горам балючым,
Дзень над агаркам ночы,
Лета над белай зімою,
Голас над цішынёю.
Толькі з усіх прызнанняў
Я называю каханне.



## ЗАПАВЕТНАЕ

Спеўны лад — старажытныя гуслі,
На стале даматканы абрус.
Пунсавеюць дзіцячыя вусны:
Беларус,
Беларусь,
Беларус!

Ад бяспомных душа абароніць
Мову нашу і род-карані,
Дзе світае меч гнеўнай Пагоні
І Грунвальда славутыя дні.

Гарт Рагнеды і веліч Скарыны,
Старажытных плямёнаў саюз.
Залунае наш сцяг над Айчынай,
Беларус,
Беларусь,
Беларус!

Хай легенда жыве аб Каліне,
Хто адолеў вайны землятрус.
Веліч продкаў у кожнай быліне —
Беларус,
Беларусь,
Беларус.

## АЎТАБІЯГРАФІЧНЫЯ ЗВЕСТКІ

Віталь Гарановіч нарадзіўся ў 1952 годзе ў вёсцы Ермакі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы служыў у арміі, некаторы час працаваў у друкарні выдавецтва «Вышэйшая школа». У 1977 годзе скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. З таго часу жыве на Глыбоччыне. Працаваў настаўнікам, дырэктарам сельскіх школ. У цяперашні час — дырэктар сярэдняй школы № 3 г. Глыбокае.

Выступае з вершамі ў раённым, абласным і рэспубліканскім друку. Адзін з аўтараў альманаха «Дзвіна» літаратараў Віцебшчыны. Неаднаразова ўдзельнічаў у рэспубліканскіх семінарах у Каралішчавічах.

## ЗМЕСТ


Справа і слова паэта. *Уладзімір Сауліч.* ........ 5
Саракі ........ 7
Родны дом ........ 8
Бацьку ........ 9
Купалле ........ 10
Мая просьба ........ 11
У Дзень Перамогі ........ 12
Беразвечча ........ 13
Дуб Гётэ ........ 14
Плач Бухенвальда ........ 15
«Зачараваны вершамі, Максім...» ........ 16
Ермакоўцы ........ 17
Матуліна вясна ........ 18
Бацькаў успамін ........ 19
Вучням ........ 20
Міхайлаўскае ........ 21
Вялікдзень ........ 22
«Зямля мая, мая сябрына...» ........ 23
«Шчэ месяц жніўны на календары...» ........ 24
Мае Налібокі ........ 25
«Павуцінне коціць ліставей...» ........ 26
«Вядзі мяне, дарожка-сцежка...» ........ 27
«Белыя заплаткі...» ........ 28
На бацькаўшчыне ........ 29
Сафійскі сабор ........ 30
Адкрываю Сталіна ........ 31
Метамарфозы часу ........ 33
У Хоўхлаве ........ 34
Памяці немаўляці ........ 35
Грынпіс ........ 37

Мая радасць ........ 38
Глыбокае ........ 39
Чорны ручэй ........ 40
«Не бойся рукі апячы аб хлеб...» ........ 41
Сяргею Ясеніну ........ 42
«Верасень — вера асенняя...» ........ 43
Прызванне ........ 44
Вякам ........ 45
«Чакаць бяды не трэба...» ........ 46
«Бульбоўнік пах...» ........ 47
«Не, не маўчыць злавесніца вайна...» ........ 48
Залатое вяселле ........ 49
«Ранак, як рамонкавы пялёстак...» ........ 50
На выставе зімовага букета ........ 51
«Гады — плыты Жыцця ракі...» ........ 52
Духоўнасць ........ 53
«Пасеяў снежань белую расаду...» ........ 54
«Той стаяў снег, што нам адкрыў лыжню...» ........ 55
Штогод ........ 56
Каляды ........ 57
«Зімой віхурна ўздыбяцца снягі...» ........ 58
Пара раўнадзенства ........ 59
«Трывожна-сумны дзень, калі...» ........ 60
Настаўніку ........ 61
Аб хлебе ........ 62
«Нябога. Да Бога...» ........ 63
Вечар сустрэчы ........ 64
«Дачакаўся вясны...» ........ 65
Прызнанне ........ 66
Прадаўжэнне ........ 67
«Мае сцюдзёныя віры...» ........ 68
«Вязуць бярозавыя дровы...» ........ 69
«Я адчуваў сябе найбольш багатым...» ........ 70
Мой край ........ 71



Першае каханне ........ 72
«Вясны замглёны рэдкі дзень...» ........ 73
«Дажджу жадаюць — не клянуць...» ........ 74
«Не вярнуць свайго юнацтва...» ........ 75
«Ты ў жыцці, нібы тайна...» ........ 76
Альма-матэр ........ 77
Пасля дажджу ........ 78
«Усё цяжэй пчале знаходзіць кветку...» ........ 79
Падаюць яблыкі ........ 80
Да лета ........ 81
Код кахання ........ 82
Мена ........ 83
«Звезлі лецейка ў стог...» ........ 84
«Пад святлом Венеры-зоркі...» ........ 85
Незнаёмка ........ 86
У Ялце ........ 87
«Хачу ў жыцці трывогі...» ........ 88
«Калі твой сын з маленства знаў ласункі...» ........ 89
Каханне ........ 90
Запаветнае ........ 91
Аўтабіяграфічныя звесткі ........ 92

Г 20

**Гарановіч В.**

**Беразвечча: Вершы / Прадм. У. Сауліча.— Мн.: Маст. літ., 1997.— 95 с.**

**ISBN 985-02-0390-0.**

**«Беразвечча» – трагічная памяць народа, усхваляваная памяць сучасніка, выток паэтычнага слова. Свежая, метафарычна прывабная паэзія Віталя Гарановіча, хто дэбютаваў творча яшчэ ў 70-х гадах,– чуйны рэзанатар думак і пачуццяў, усяго таго, з чаго творыцца харáство чалавечай душы.**

Г $\frac{8820600000 - 001}{М\ 302(03)-97}$ БЗ 44—96

ББК 84(4Беи)6

Літаратурна-мастацкае выданне

*Гарановіч Віталь Рыгоравіч*

**БЕРАЗВЕЧЧА**

**Вершы**

Рэдактар М. М. Мятліцкі. Мастак А. М. Малышава. Мастацкі рэдактар А. М. Малышава. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар І. Б. Бутовіч. Аператар В. І. Барута.

Падп. да друку 09.12.96. Фармат 70х90 1/32. Папера кн.-часоп. Гарнітура тып. Таймс. Афс. друк. Ум. друк. арк. 3,51. Ум. фарб.-адб. 3,8. Ул.-выд. арк. 2,3. Тыраж 1000 экз. Зак. 5035.

Набрана і звярстана на настольна-выдавецкай сістэме.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11.

